# «НА АДУКАЦЫЮ І АХОВУ ЗДАРОЎЯ ДЗЯРЖАВА ГРОШАЙ НЕ ПАШКАДУЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як было далажана Прэзідэнту, плануецца, што ў найбліжэйшай будучыні і гэта праблема будзе знята. Гаворачы аб поспехах, дасягнутых у Беларусі ў сферы барацьбы з анкалагічнымі захворваннямі ў дзяцей, Вольга Алейнікава адзначыла, што, калі яна прыйшла ў анкалогію больш як 30 гадоў таму, сярэдняя працягласць жыцця дзіцяці, хворага на рак, была каля месяца. Цяпер жа амаль 75 працэнтаў дзяцей з гэтай страшнай хваробай поўнасцю вылечваюцца.

Дырэктар цэнтра таксама расказала, што ў хуткім часе побач з РНПЦ плануецца пабудаваць пансіянат на 100 месцаў, дзе будуць жыць бацькі юных пацыентаў. Кіраўнік дзяржавы адобрыў гэту ідэю, падкрэсліўшы, што бацькі павінны мець магчымасць знаходзіцца побач са сваімі дзецьмі.

Гаворачы аб развіцці медыцыны ў цэлым і анкалагічнай дапамогі ў прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што грошы трэба лічыць, накіроўваць туды, куды гэта сёння неабходна, фінансуючы першачарговыя праекты. Прэзідэнт Беларусі наведаў некалькі аддзяленняў РНПЦ, аперацыйны блок, пагутарыў з пацыентамі і іх бацькамі. Ён таксама агледзеў гульнявы пакой, дзе ў гэты час праходзілі заняткі дзяцей з педагогамі. Дзякуючы індывідуальнаму навучанню пасля выздараўлення дзеці могуць весці не толькі паўнацэннае жыццё, але і вярнуцца ў свой клас. У гэтым жа гульнявым пакоі ўстаноўлены два ноўтбукі, перададзеныя ў дар РНПЦ ад імя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Праз інтэрнэт дзеці атрымаюць дадатковую магчымасць для сувязі з бацькамі.

Падчас наведвання РНПЦ Аляксандр Лукашэнка таксама пагутарыў з дзяўчынай, якая некалькі гадоў таму атрымала лячэнне ў гэтай установе і поўнасцю выздаравела. Штогод у цэнтры высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу атрымліваюць да 5 тыс. пацыентаў.

Зарплата ўрачоў павінна залежаць у першую чаргу ад іх прафесійнага ўзроўню, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў пытанні заработнай платы ўрачоў «не будзе ўраўнілаўкі». «Так, у нас ёсць пакуль праблемы з маладымі ўрачамі. Нам трэба падумаць, як іх яшчэ падтрымаць, — адзначыў Прэзідэнт. — Не будзем падтрымліваць маладога ўрача — не будзе свяцілаў».

«Калі размова ішла аб заработнай плаце, мы доўга думалі, як плаціць. Але нельга ўраўнілаўкай займацца. Трэба суперурачам плаціць суперзарплату, сярэднім — сярэднюю, ну а тых, якія яшчэ не падцягнуліся да гэтага, мы не можам ураўнаваць са свяцііламі. Гэтага нельга рабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У прыватнасці, сёння ў Беларусі вызначана кола з прыкладна 50 розных відаў аперацый, за правядзенне якіх дзяржава плаціць значныя грошы.

**БЕЛТА.**

# УЗЛЁТ «ЖУРАЎЛІНАГА»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асартымент крамы (на свае вочы бачыла) нічым не саступае гандлёвым прадпрыемствам абласнога цэнтра. Каўбасы, мясныя, малочныя прадукты — усё некалькіх відаў розных вытворцаў. Побач — кулінарыя, дзе неўзабаве можна будзе набыць свежыя паўфабрыкаты і гатовыя вырабы. І гэта, несумненна, ацэняць вясковыя гаспадыні.

Рэстаран пакуль не зусім гатовы, але брыгада будаўнікоў, падобна на тое, уносіць апошнія штрыхі ў яго аздабленне і добраўпарадкаванне. Масіўныя драўляныя сталы і крэслы чакаюць свайго часу, каб быць расстаўленымі ў зале. Вялікая зала рэстарана афармлена ў сярэднявечным стылі. Зверху звісаюць жырандолі ў выглядзе колаў, на сценах прымацаваны гербы знакамітых родаў зямлі беларускай. Сцены, столь, мэбля зроблены пад дрэва: сучасна, стыльна і пад старадаўнасць.

## Бона кастынг не прайшла

Любоў Паўлаўна — філолаг па адукацыі, цудоўна ведае гісторыю сваіх мясцін. Як патрыёт даўніны, яна загарэлася ідэяй назваць комплекс «Фальварак у Боны» у гонар каралевы, якая валодала некалі гэтымі землямі, падаравала Магдэбурскае права Пружанам. Але знайшліся апаненты, якія ідэю не падтрымалі. Перамагла думка, што трэба надаць цалкам беларускую назву. Пакуль такая назва не нарадзілася, і гаспадары «фальварка» з удзячнасцю прымаюць усе прапановы.

Падчас азнаямлення з такім не зусім звычайным для вёскі аб'ектам, міжволі ўзнікае пытанне, на каго ён разлічаны. Калі жыхары аграгарадка пайшлі ў басейны і трэнажорныя залы, гэта не азначае, што яны пойдуць у рэстаран, а сваіх гасцей-родзічаў павядуць у гатэль. «Вядома, мы чакаем турыстаў, — перахоплівае пытанне ў вачах Любоў Гоган. — Не так далёка Белавежская пушча, зараз будуецца аб'язная дарога вакол нацыянальнага парку. Думаем, што будуць госці і ў гасцінічных нумарах, і ў рэстаране. Дарэчы, апошні яшчэ і не адкрыўся, а прапаноў мы атрымліваем шмат. Нават карпаратыўныя вечарыны замаўляюць фірмы з Брэста. Калі рэстаран зарэкамендуе сябе, думаю, кліенты знойдуцца, каб адпачыць не ў горадзе, з добрай кухняй і абслугоўваннем».

Менавіта на такі ўзровень будуць арыентаваць усіх 22-х работнікаў новага комплексу, якіх плануецца неўзабаве прыняць на працу.

## Жыві і помні

Практычна разам з усімі аб'ектамі сучаснага і зручнага жыцця непадалёк узводзілі помнік землякам, якія бязвінна загінулі падчас апошняй вайны. 17 ліпеня 1942 года стаў трагедыяй тутэйшых мясцін. З вёсак Казлы, Кушалі, Ліхачы, Краснае, Нямковічы, Пасталова, Сілічы карнікі сагналі і расстралялі ўсіх мужчын, старэйшых за 16 гадоў. Новы час, які наступіў за гэтым, стаў парой удовіных і мацярынскіх слёз. У адных толькі Казлах былі забітыя ў той дзень 182 чалавекі. Недалёка ад месца, дзе расстраляныя і пахаваныя людзі, узнёсся ўвысь манумент. Вакол помніка пасаджана 180 дубкоў і дзве бярозы. Ніхто цяпер дакладна не ўспомніць, як атрымалася, але ў той ракавы дзень разам з мужчынамі забілі і дзвюх жанчын...

У распрацоўцы канцэпцыі помніка браў удзел і кіраўнік Нацбанка Беларусі Пётр Пракаповіч. Пётр Пятровіч родам з вёскі Казлы. І ўвекавечыць памяць землякоў палічыў сваім святым абавязкам. Нацбанк дапамог і ў фінансаванні будаўніцтва манумента, а таксама іншых аб'ектаў аграгарадка.



Помнік у Казлах.

* * *

«Пастунова «Жураўлінае» становіцца адной з прыгажэйшых мясцін на Пружаншчыне», — гаворыць старшыня раённага Савета Віктар Макарэвіч, з якім мы наведалі вёскі. А старшыня сельсавета Святлана Ханавец скардзіцца, што катастрафічна памяншаецца асабісты статак у вяскоўцаў, усё менш ахвотных займацца асабістай гаспадаркай. Але ж даводзіцца канстатаваць і ў рэшце рэшт згаджацца, што гэта працэс аб'ектыўны. Як той казаў, за што змагаліся, там і аказаліся. На самым пачатку стварэння аграгарадкоў было задумана, што ўмовы пражывання людзей там павінны набліжацца да гарадскіх. І калі зарплата ў ААТ «Жураўлінае» самая большая ў раёне (сярэдні яе паказчык даўно перавысіў адзнаку ў мільён рублёў), то наіўна чакаць, што людзі кінуцца набываць кароў і свіней у асабістае карыстанне. Наадварот, яны пасля работы ідуць у басейн, спартыўную залу, а за прадуктамі заходзяць у крамы. Дарэчы, мясцовыя яблыкі тут прадаюцца па цане крыху больш за тысячу рублёў. У Брэсце такіх цэн днём з агнём не знойдзеш.



Такія дамы ў «Жураўліным».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*Пружанскі раён.*

## БЕЛАРУСЬ ПА ІНДЭКСЕ ЎЗРОЎНЮ АДУКАЦЫІ АПЯРЭДЖВАЕ ГЕРМАНІЮ, АНГЛІЮ І ЯПОНІЮ

Пра гэта паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўрадзе.

Згодна з дакладам аб развіцці чалавека за 2009 год у рэйтынгу па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь заняла 68 месца сярод 182 краін і тэрыторый свету і ўвайшла ў лік краін з высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу. Пры гэтым па індэксе ўзроўню адукацыі (0,961) Беларусь падзяляе з Латвіяй 26 месца і апярэджвае шэраг краін Еўропы — Швейцарыю (0,936), Чэхію (0,938), Германію (0,954), Польшчу (0,952), Балгарыю (0,930), Расію (0,933), а таксама Японію (0,949), Ізраіль (0,947), Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі (0,957).

## У БЕЛАРУСІ СПРОШЧАНЫ ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ПЕРАПЛАНІРОЎКІ КВАТЭР

Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 1526 ад 20 кастрычніка 2010 года. Пашыраны пералік рамонтна-будаўнічых работ, якія не патрабуюць дазволу выканкама і распрацоўкі праекта. У яго дадаткова ўвайшлі работы па дэмантажу ваннай і ўстаноўцы душавой кабіны, пераносу існуючай і (або) устаноўцы дадатковай водаразборнай арматуры, замене ўнутрыкватэрных трубаправодаў водазабеспячэння і каналізацыі, а таксама падлогавага пакрыцця. Дазвол неабходны для таго, каб змяніць колькасць і (або) агульную плошчу жылых памяшканняў дома, замяніць нясучыя канструкцыі, змяніць будаўнічы аб'ём або плошчу дома і (або) нежылых пабудоў, аснасціць іх дадатковымі відамі інжынернага абсталявання, уладкаваць балконы і лоджыі, а таксама ўладкаваць і пераўладкаваць вонкавыя сеткі. Новыя рэдакцыі палажэнняў уступяць у сілу праз месяц пасля афіцыйнага апублікавання пастановы.

**БЕЛТА.**

## ПРАДПРЫМАЛЬНЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ

**У суд перададзена крымінальная справа аб сістэматычным атрыманні хабараў двума выкладчыкамі Гомельскага дзяржаўнага дарожна-будаўнічага каледжа.**

Нагадаем, сёлета ў чэрвені супрацоўнікі Гомельскага ўпраўлення КДБ затрымалі выкладчыцу гэтай навучальнай установы. Гэта адбылося падчас атрымання жанчынай незаконнага грашовага ўзнагароджання ад навучэнца — за паспяховую здачу экзамена. У ходзе расследавання ў крымінальнай справе з'явіўся яшчэ адзін фігурант — муж затрыманай, выкладчык таго ж каледжа. У грашовым эквіваленце ацэньваліся залікі, іспыты, курсавыя работы. Для кожнай «паслугі» існавала свая такса: у сярэднім ад 30 да 200 тысяч беларускіх рублёў. Некаторым давалі магчымасць «здаць» іспыты... у доўг. У затрыманай выкладчыцы канфіскавалі сшыткі, у якіх яна вяла падрабязны ўлік незаконных даходаў. 228 крымінальных спраў, заведзеных у дачыненні да выкладчыцы, аб'ядналыя ў адну вытворчасць. У крымінальнай справе прадстаўлена больш за 170 сведкаў. Размова ідзе аб атрыманні незаконных грашовых узнагарод на агульную суму больш за 30 мільёнаў беларускіх рублёў. Як расказалі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, сужэнцам прад'яўлена абвінавачванне ў атрыманні незаконных грашовых узнагарод, учыненых паўторна групай асоб па папярэдняй змове.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## З НАЖОМ І КАЧАРГОЙ

Сварка паміж мужам і жонкай у вёсцы Гнеўчыцы Іванаўскага раёна скончылася злачынствам. Нецвярозая 36-гадовая кабета нажом ударыла мужа. З пранікальным раненнем груднoй клеткі і пашкоджаннем унутраных органаў 42-гадовы мужчына дастаўлены ў бальніцу. Жонка затрымана.

У Століне два 20-гадовыя хуліганы качаргой і кіем збілі: мужчын 20-ці, 26-ці і 32-х гадоў. У свае дваццаць абодва зламыснікі ўжо маюць судзімасці за крадзяжы.

**Яна СВЕТАВА.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## БЕЛАРУСЬ — АДНА З НАЙМЕНШ КАРУМПАВАНЫХ У СНД

**Расія заняла 154-е месца з 178 магчымых у індэксе ўзроўню карупцыі краін свету, падрыхтаваным Transparency International. У 2010 годзе Расіі было выстаўлена 2,1 бала з магчымых дзесяці. Годам раней Расія займала ў рэйтынгу Transparency International 146-е месца.**

Расія ў рэйтынгу 2010 года дзеліць сваё 154-е месца з такімі краінамі, як Папуа-Новая Гвінея, Таджыкістан, Конга і Гвінея-Бісаў. З краін СНД у спісе гэтага года лідзіруюць Казахстан і Малдова, якія займаюць 105-е месца. Абагналі Расію ў спісе таксама Арменія (123-е месца), Беларусь (127-е месца), Украіна і Азербайджан (дзеляць 134-е месца).



Найвышэйшы бал у рэйтынгу Transparency International атрымалі Данія, Новая Зеландыя і Сінгапур — 9,3 бала. Апошняе месца ў рэйтынгу заняла Самалі. Ёй было прысвоена 1,1 бала.

## У АКІЯНАРЫУМЕ АБЕРХАЎЗЭНА ПАМЁР ЗНАКАМІТЫ ВАСЬМІНОГ-ВЯШЧУН ПАЎЛЬ

**У аўторак раніцай у акіянарыуме Sea life нямецкага горада Аберхаўзэна памёр знакаміты на ўвесь свет васьміног-вяшчун па мянушцы Паўль. Падчас нядаўняга чэмпіянату свету па футболе ў ПАР ён правільна адгадаў усе вынікі зборнай Германіі, а таксама правільна назваў чэмпіёна і бронзавага прызёра сусветнага першынства.**

У акіянарыуме абяцаюць, што праз некаторы час у іх з'явіцца новы Паўль, передае «Савецкі спорт».

Супрацоўнікі Sea Life плануюць арганізаваць своеасаблівы мемарыял у гонар знакамітага васьмінога-вешчуна. На вялікім экране яны маюць намер паказваць самыя прыгожыя і хвалюючыя моманты яго жыцця, а таксама выставіць на ўсеагульны агляд урну з прахам Паўля і памятныя падарункі з усяго свету.



Асобіны віду Octopus vulgaris жывуць самае большае тры гады, і па людскіх мерках Паўль быў ужо дзядулем. Пасля ЧМ-2010 ён быў акружаны ласкай і клопатам, забяспечаны ўсім неабходным. Нягледзячы на сусветную славу, Паўль быў даволі сціплы: ён здавольваўся сайдай і дзвюма мідыямі ў дзень.

## ЗША ПЕРАТВОРАЦЬ ГУАМ У ПЛАЦДАРМ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З КІТАЕМ?

**ЗША плануюць пашырыць сваю ваенную прысутнасць на Гуаме — найбуйнейшым стратэгічным ваенным аб'екце Вашынгтона ў Ціхім акіяне. Як пісала 26 кастрычніка The Telegraph, планы ЗША звязаныя з умацаваннем пазіцый Кітая на моры.**

У прыватнасці, ЗША збіраюцца пабудаваць на востраве док, здольны прымаць атамныя авіяносцы тыпу «Німіц». Акрамя таго, запланавана абсталяванне Гуама найноўшымі сістэмамі супрацьракетнай абароны і пашырэнне авіябазы «Андэрсан», размешчанай на паўночны ўсход ад астраўнога мястэчка Юга.

Паводле папярэдніх ацэнак, запланаваныя работы абыдуцца амерыканскаму бюджэту ў 12 мільярдаў долараў. Сума, выдаткаваная на ўмацаванне Гуама, стане рэкорднай для ціхаакіянскага рэгіёна з часоў Другой сусветнай вайны і найбуйнейшым ваенна-марскім праектам за апошнія дзесяць гадоў.

# ЛІКВІДНЫХ АДНАПАКАЁВАК АМАЛЬ НЕ ЗАСТАЛОСЯ

**Даволі цікавая сітуацыя гэтай восенню назіраецца на мінскім рынку арэнды жыллёвай нерухомасці. Ажыятажны попыт на кватэры звычайна бывае ў жніўні і верасні, калі на рынку актывізуюцца «новыя» студэнты, а потым ідзе адкат попыту... Сёлета на рынку ўсё крыху інакш.**

Сёння самыя слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры са старой мэбляй ці часткова з мэбляй можна адшукаць па кошце 200—220 долараў толькі ў Заводскім раёне і Шабанах. У Курасоўшчыне, Малінаўцы і нават у новабудоўлях звычайныя стандартныя аднапакаёўкі каштуюць ужо 230—260 долараў.

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬШЫ**, ліквідных аднапакаёвых кватэр (сярэдняя якасць жылля адпавядае сярэдняму кошту арэнды 250 долараў) уздоўж лініі метро сёння ўжо амаль не засталося. Лепшыя па якасці невялікія кватэры з сучасным рамонтам, мэбляй і бытавой тэхнікай побач з метро каштуюць ужо 300—350 долараў, аднак і такіх кватэр сёння хапае ўжо не для ўсіх кліентаў. У зусім «свежых» новабудоўлях аднапакаёўкі без мэблі каштуюць 200, а з мэбляй 250 долараў. Двухпакаёўкі там без мэблі прапануюцца за 250, а часткова з мэбляй за 300 долараў. Трохпакаёўкі з кухняй каштуюць 350 долараў плюс камунальныя паслугі.

Сапраўды якасныя двухпакаёвыя кватэры бліжэй да цэнтра каштуюць цяпер 800—900 долараў.

У апошні месяц з'явіўся нават нядрэнны попыт і на стыльныя вялікія кватэры эліт-класа. Гэта трох-, чатырохпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай каля 85—90 квадратных метраў, дзе рамонт ажыццяўляўся з дапамогай прафесійных дызайнераў. Арэнда такога жылля каштуе сёння 1,2—1,7 тысячы долараў. Кватэры па такім цэнніку цяпер здымаюць прыватныя камерцыйныя фірмы, багатыя прадпрымальнікі з Расіі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў...

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці прагназуюць падаражанне якасных і ліквідных кватэр менавіта ў лістападзе і ў першай палове снежня. Адразу пасля выбараў попыт на хадавыя кватэры (сярэдняя якасць, побач метро) і дарагое жыллё павінен істотна паменшыцца. А адсутнасць стабільнага попыту павінна выклікаць патанненне арэнды.

Праўда, эксперты рынку арэнды не выключаюць, што на сегменце звычайных стандартных кватэр і жылля ў новабудоўлях працэс патанення арэнды можа адбыцца і раней — калі кватаранты атрымаюць «цяжкія цэтлікі» па кватэрнай плаце. А вось сапраўды якасныя кватэры з сярэднім цэннікам таннець увогуле не будуць, упэўнены спецыялісты рынку жыллёвай нерухомасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Абзац

◢ 25 кастрычніка здарыўся пажар на сталічным прадпрыемстве «Мінскдрэў». Паведамленне паступіла на пульт дзяжурнага МНС ад вартаўніка прадпрыемства. Праз некалькі хвілін выратавальнікі былі на месцы. Гарэлі адходы драўніны на адкрытай плошчы 200 кв. метраў. Пацярпелых няма, нікога не эвакуявалі, прычына здарэння высвятляецца. Сувязі з пажарам на «Пінскдрэве» спецыялісты не бачаць.

◢ **Нелегальная партыя электронных носьбітаў інфармацыі на суму Br205 млн канфіскаваная ў Браслаўскім раёне. Груз быў выяўлены пры правядзенні спецмерапрыемстваў мытнікамі сумесна з памежнікамі і працаўнікамі падатковай інспекцыі. Пры абследаванні гаспадарчых пабудоў у г.п. Відзы быў знойдзены склад тавараў вытворчасці Еўрасаюза. У непрыстасаваным памяшканні захоўвалася больш за 3,7 тыс. новых гульнявых флэш-картаў, кампакт-дыскі для гульнявых прыставак, а таксама 6,3 тыс. футляраў для кампакт-дыскаў. Праводзіцца праверка.**

## Поўны абзац



◢ Эмір Кустурыца стаў «ганаровым удмуртам». Творчая інтэлігенцыя Удмуртыі, дзе адбыўся канцэрт групы «The No Smoking Orchestra», прысвоіла сербскаму рэжысёру званне «Ганаровы удмурт». Такое ж званне раней атрымалі мастак Казімір Малевіч, касманаўт Юрый Гагарын, рок-музыкант Сяргей Курохін, паэт Дзмітрый Прыгаў і музычны крытык Арцемій Троіцкі. Разам з граматай аб прысваенні ганаровага звання Кустурыцы ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі драўляны нагрудны знак і войлачную шапку. Славуты музыка і рэжысёр прызнаўся, што ў Іжэўску адчувае сябе намнога больш камфортна, чым у Нью-Ёрку, дзе ён 2 гады выкладаў у Калумбійскім універсітэце.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# АКНО Ў ПАРЫЖЫ...

## РАССЕЯНАЕ СВЯТЛО

Падрыхтоўка да выставы ішла досыць складана: аўтар хацеў паказаць у Беларусі не выпадковыя творы, а сутнасць свайго парыжскага перыяду — праз 37 твораў жывапісу, графікі і нават адну скульптуру. Выстава спецыяльна фарміравалася для Мінска, і галоўны музей краіны пайшоў дзеля яе на неверагодны крок: знарок перафарбавалі сцены адной з залаў з зялёнага колеру ў белы.

— Было вельмі складана тэхнічна сабраць лепшыя творы, гэта няпроста і фінансава, патрабуе бюджэту, каб рабіць вялікую рэтраспекцыю. Мы не мелі такіх магчымасцяў, — прызнаецца аўтар. — Гэтыя працы збіраліся толькі з блізкага (напэўна, па мерках Заборава. — Аўт.) замежжа: Англія, Бельгія, Галандыя, Францыя... Яны прадстаўляюць малую частку маёй працы. Выстава, на мой погляд, атрымалася ўдалай. Мяне абсалютна задавальняе памяшканне, дзе размясціліся творы, а таксама тое, што ўдалося ўсталяваць рассеянае святло. Бо мае карціны значна лепш успрымаюцца пры такім асвятленні, а не пры кропкавым. Я не ўяўляю, што можна паставіць святло такім цудоўным чынам, як гэта адбылося. Яно дае адчуванне паветра.



## ДАЛЁКІ ШЭРЫ

Нельга сказаць, што Забораў быў абсалютна невядомым мастаком у Беларусі перыяду СССР да ад'езду. Ён актыўна працаваў, зарабляючы на жыццё афармленнем кніг — у тым ліку класікаў беларускай літаратуры, напрыклад, Купалы. Сярод кніжных графікаў карыстаўся аўтарытэтам, у нейкі час мог нават выбіраць сам, якую кніжку хоча аформіць. Мог бы так жыць і далей. І вось на табе: аднойчы вырашыў адкрыць для сябе акно ў Парыж. Натуральна, Парыж для мастакоў — гэта горад, дзе здаўна правяраецца іх вартасць і ўвасабляюцца самыя смелыя творчыя задумы. Але каб вось так рызыкаваць, страціўшы ўсё тое, што мог мець мастак у «саўку» і пачаць з нуля...

— Ёсць мільён прычын для таго, каб з'ехаць. Прааналізаваць увесь гэты шлях я не ў стане, — прызнаецца Забораў. — У Мінску я быў іншым мастаком, да пераезду ў Францыю паспяхова займаўся кніжнай графікай. Менавіта жаданне заняцца жывапісам вымусіла да ад'езду. Я заўсёды думаў, што ў кніжнай графіцы мастак — персона другасная. Ён заўсёды знаходзіцца пад уплывам літаратурнага тэксту, ён павінен інтэрпрэтаваць яго. Гэта мне перашкаджала — так, што ў нейкі момант хацелася быць і аўтарам сцэнарыя, і выканаўцам галоўнай ролі ў адной асобе. Што ў мяне і атрымалася ў выніку.

## ЭПІЗАДЫЧНЫ ЧЫРВОНЫ

Калі чалавек з'язджае, то губляе асяроддзе, якое з'яўляецца часткай яго асобы. Для творцы гэта значыць шмат. У Заборава на радзіме былі людзі, з якімі ён сябраваў, быў блізкі духоўна. Гэта асобы, якія належалі да творчай эліты — не толькі мастакі, але і людзі кіно, пісьменнікі (напрыклад, Куляшоў, Танк, Быкаў...). На пытанне «Звязды» пра тое, ці проста было парваць усе сувязі і вырашыцца на вымушаную адзіноту ў іншай краіне і ці знайшоў мастак сваё асяроддзе ў Парыжы, ён адказаў:

— Першыя 15 гадоў усё было абарвана, як вы разумееце. Але ў сувязі з вядомымі падзеямі, якія змянілі краіну, якую я пакінуў, усё змянілася. Я наладзіў кантакты з былымі сябрамі, час ад часу яны наведвалі мяне. А духоўная сувязь ніколі не прыпынялася. Так, у мяне былі сябры сярод паэтаў, пісьменнікаў, у большасці гэтыя людзі ўжо сышлі. Я б хацеў сустрэць тых, хто жывы, як Рыгор Барадулін... Маё асяроддзе ў Парыжы прыблізна такой жа якасці. Гэта людзі тэатра, пісьменнікі, паэты, менш мастакоў. Хоць практычна з усімі мастакамі, якія жывуць у Парыжы, у мяне цудоўныя адносіны, але больш за 2-3 чалавекі ў ліку сваіх блізкіх сяброў я не магу назваць. Духоўнае асяроддзе ўвесь час застаецца з намі, гэта не залежыць ад перамены месца жыхарства.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## АДЦЕННІ ЗЯМЛІ

Цяпер ён можа шчыра расказваць пра тую адзіноту, якую прыйшлося перажыць ў першыя гады парыжскага жыцця — без дасканалай французскай мовы, пры падтрымцы хіба самых блізкіх — сям'і — яму ўдалося зрабіць немагчымае. Па нашых мерках. Але Забораў прызнаецца, што і цяпер з французскай не на «ты», што пазбягае вялікіх сходаў, дзе трэба казаць нейкія прамовы. Аднак лічыць Парыж «сваім» горадам.

— Шмат гарадоў блізкіх для мяне, размяркоўваць іх па месцах я не буду. Мінск родны горад, Парыж родны, горад, дзе я стаў тым, кім стаў. Яшчэ добры горад Верона, я там працую... Па перакананнях я — чалавек свету. Я проста мастак, і ўсё. Каранямі я тут. Але падсумаваў увесь свой вопыт, дасягнуў цяперашняга творчага ўзроўню ў Францыі. Мне здаецца, што ў маіх творах прысутнічае ўсё, што зведаў у гэтым свеце: беларускае дзяцінства, руская культура, на якой выхаваны, еўрапейская частка — французская культура, дзе я рэалізаваўся як творца.

Па прызнанні Барыса Абрамавіча, Мінск вельмі змяніўся пасля яго ад'езду. Самае яркае яго ўражанне ад беларускай сталіцы — іншая публіка, адкрытыя твары. А італьянскім і французскім сябрам Заборава, якія прыехалі разам з ім, спадабаўся мінскі «сталінскі ампір».

## УДАЛЫ ЗЯЛЁНЫ

Мінск вітае Барыса Заборава як зорку. Так і ёсць: проста мы мала ведаем пра мастацкае жыццё, якое існуе недзе па-за межамі нашай краіны. Нам цяжка ўявіць рэальныя маштабы замежных выстаў, у якіх прымаюць удзел нашы творцы, якія выехалі ў пошуках і чаканнях дасведчанай, зацікаўленай і актыўнай публікі. Нас могуць уразіць іх асабістыя перамогі ў канкрэтных праектах, калі ёсць нагода напоўніцца пачуццём гонару: маўляў, нашы людзі ды ў Галівудзе... Ці як у Заборава — у галерэі Уфіцы. Але калі б гэтага не было, ён усё роўна быў бы такім жа таленавітым мастаком, які мае свой погляд на свет і выдатна валодае майстэрствам.

— Мая праца ва Уфіцы: як заўсёды, усё здарылася выпадкова, калі наогул выпадковасць існуе. Праца «Мастак і яго мадэль» удзельнічала ў праекце «Аўтапартрэт XX стагоддзя». Выстава правісела два месяцы ў Парыжы і потым пераехала ва Уфіцы. Потым ад іх была прапанова, доўга ішлі перамовы аб набыцці, гэта было звязана з грашыма. Але насуперак распаўсюджанаму меркаванню, я не першы сучасны мастак, творы якога набыла гэтая галерэя. Там, дарэчы, у калекцыі ёсць наш зямляк Шагал. Так здарылася, што пасля 1958 года гэтая галерэя ўпершыню набыла мой твор.

## ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНЫ БЛАКІТНЫ

Ён кажа пра тое, што наўрад ці магчыма будзе калі-небудзь выставіць творы яго «мінскага перыяду» — сабраць арыгіналы графічных твораў досыць складана. Ён па-ранейшаму з трымценнем ставіцца да кнігі як да культурнай з'явы і кажа пра небяспеку яе выцяснення з культурнай прасторы — адсюль і тэма скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай пісьменству. Ці не гэтыя думкі прывялі яго да пошукаў у іншым відзе мастацтва — кіно, спытала я, а ён адказаў:

— Я кіно не люблю як жанр. Але гэта не азначае, што мне не хочацца сябе ў ім паспрабаваць. Мне сябры падарылі ўсё абсталяванне, каб здымаць кіно. І я зняў кароткаметражны фільм. У ім удзельнічала цудоўная актрыса Шарлота Рэмплінг, якую вы можаце ведаць па фільму «Начны парцье». Я не выключаю магчымасці зняць яшчэ і поўнаметражны фільм. Гэта фільмы выключна аўтарскія, некамерцыйныя. Тым больш што можна знайсці на гэтыя карціны мецэната ці спонсара...

Таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім, як кажуць. Можна дадаць: таленавіты паўсюдна, дзе б ні жыў.

## СУМНЫ РУЖОВЫ

Творы Заборава падобныя на старыя фотакарткі, якія выцвілі. Гэта яго фірмовы аўтарскі стыль, які ён знайшоў менавіта ў Парыжы. І нейкай дзіўнай настальгіяй павявае ад іх. Дзіўнай, таму што не па мінулым і страчаным, а па вобразах, якія пакуль захоўваюцца ў памяці. Жывуць, нібыта ў ранішнім сне, на мяжы абуджэння, калі вельмі не хочацца прачынацца, але розум ужо змірыўся з тым, што ўсё роўна прыйдзецца. І вобразы, якія вось-вось знікнуць, здаюцца нейкімі роднымі, да болю знаёмымі, але пазнаць іх ніяк не можаш, ад чаго робіцца сумна.

— Сумнае адчуванне — гэта рыса любой творчасці, — гаворыць аўтар і тлумачыць, чаму яго вобразы спісаныя з ананімных мадэляў: — Я бадай што не пішу сваіх блізкіх у такім стылі. Ёсць некалькі такіх твораў, дзе мае сябры, але гэтыя творы я не паказваю. Не пішу блізкіх, бо гэта мяне скоўвае як мастака, абмяжоўвае ўяўленне, фантазію.

І ўсё-такі на выставе ў Мінску на адной з карцін можна пабачыць аўтапартрэт самога Заборава. Прыглядзіцеся — і вы пазнаеце яго. Як пазнаеце, ці здагадаецеся пра тое, што ў яго ўяўленні па-ранейшаму жывуць вобразы роднага краю...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ

## ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

Организатор аукциона — **Столовичский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области**

| № п/п | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика | Площадь земельного участка, га | Назначение участка | Начальная цена земельного участка, рублей | Сумма задатка, рублей | Затраты на организацию и проведение аукциона, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Столовичский с/с, д. Домашевичи, ул. Новая, 3а, кадастровый номер 120489001101000145 | Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети | 0,1592 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 192186 | 19200 | Стоимость за государственную регистрацию — 70000 рублей, информационных сообщений в средствах массовой информации — газеты «Наш край», «Звязда» |

**1.** Аукцион состоится 30 ноября 2010 года в 15.00 в здании культурно-досугового центра д. Столовичи по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, д. Столовичи, ул. Барановичская, д. 5а.

**2.** Условия аукциона:

- к участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в соответствии с действующим законодательством.

**3.** Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

**4.** Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 15%.

**5.** Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорта) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**6.** Сумма задатка перечисляется до 24 ноября 2010 г. до 17.00 на р/с 3600211200008, в ф-л 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код платежа 4901, УНП 200018629.

Адрес банка: г. Барановичи, б-р Штоккерау, 8А.

Получатель: Столовичский сельский исполнительный комитет, 225312, Брестская область, Барановичский район, д. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Результаты аукциона утверждаются решением комиссии по проведению аукциона.

В случае наличия одной заявки предмет аукциона может быть продан по начальной цене с учетом шага аукциона по решению комиссии.

**7.** Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел. (8 0163) 43 52 36, 43 52 86.

**8.** Продажа земельного участка производится без изменения его целевого назначения.

**9.** Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 8.00 до 17.00 в Столовичском сельисполкоме. Последний день приема документов 25 ноября 2010 г. до 15.00.

Заключительная регистрация участников аукциона 30 ноября 2010 года с 14.00 до 14.45.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**11.** Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона (в том числе затраты, связанные с размещением извещений о проведении аукциона в средствах массовой информации); внести плату за земельный участок. Не позднее 2-х месяцев после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

# ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

***10 ноября 2010 года проводит 13-й открытый повторный аукцион по продаже имущества республиканской собственности***

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 97. | Электростанция ЭД2х30/Т400-1РАМ1 № АС5273СПОД на КАМАЗ-43101, ш. 0029591, дв. 0771745, 4 кат. | г. Береза в/ч 23324 | 1991 | 1764 26 м/ч | 46 000 000 | 4 600 000 |
| 98 | Электростанция ЭД2х30/Т400-1РАМ1 № ЮТ7904РМДИ на КАМАЗ-43101, ш. 0016478, дв. 0625680, 2 кат. | г. Береза в/ч 23324 | 1990 | 1208 33 м/ч | 45 000 000 | 4 500 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **10 ноября 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00** часов **8 ноября 2010 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 10 ноября 2010 г.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

По ранее проведенным торгам извещение опубликовано в газете “Звязда” № 144 от 27 июля 2010 года.

## У лістападзе зборная згуляе з Аманам

Трэнерскі штаб нацыянальнай каманды вызначыўся з супернікам, з якім правядзе таварыскі матч падчас міжнароднага «акна»,17 лістапада. Як і меркаваў Бернд Штанге, гульня пройдзе ў адной з цёплых азіяцкіх краін. Нашым супернікам будзе зборная Амана. У рэйтынгу ФІФА гэтая каманда дзеліць 96-ты радок са зборнай Узбекістана. Нашы футбалісты, нагадаем, знаходзяцца на 42-й пазіцыі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Дзве даты. 27 кастрычніка



**1557 год** — каралём Жыгімонтам II Аўгустам выдадзены «Лясны статут». Гэта быў першы падобны дакумент на славянскай мове. Паводле новага закона, для разбору розных цяжбаў аб праве карыстання лесам і сенажацямі была створана спецыяльная камісія. Ляснічыя атрымалі падрабязную інструкцыю пра дзеянні падчас аб'езду пушчаў і лясоў. Статут забараняў высечку сухіх дрэў без дазволу каралеўскай улады, вызначаў пакаранне за самавольнае размяшчэнне пчаліных вулляў у дуплах дрэў, абмяжоўваў рыбную лоўлю і колькасць паляўнічых сабак. За забойства буйнага звера была вызначана вышэйшая мера пакарання.

**1984 год** — уведзена ў строй Байкала-Амурская магістраль.

## Цытата дня

*«Той, хто хлусіць, не аддае сабе справаздачы ў цяжкасці сваёй задачы, бо яму трэба будзе яшчэ разоў дваццаць схлусіць, каб падтрымаць сваю першую ману».*

**Аляксандр Поп (1688—1744), англійскі паэт.**

## Гастролі

# ШЫК ПА-ПОЛЬСКУ

*1500 касцюмаў дзеля аднаго канцэрта: Польскі дзяржаўны ансамбль танца «Мазоўша» ва ўсім бляску*

Выступленне польскага ансамбля «Мазоўша», якое адбудзецца 27 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі, абяцае быць шыкоўным відовішчам. Бо ансамбль — гэта 100 артыстаў, за якімі ездзіць 8 тон багажу. І выступленне інтрыгуе ўжо тым, што дае магчымасць паглядзець на шыкоўныя касцюмы. Падчас канцэрта кожны танцор мяняе касцюмы 7-9 разоў, прычым на гэта ідзе ўсяго пару хвілін. Ансамбль, які стаў легендай польскай культуры, выступіць у Мінску больш чым праз 30 гадоў.

Яны выступалі па ўсім свеце. Іх гледачамі былі каралеўскія асобы, прэзідэнты, іх віталі Генеральны сакратар ААН і Папа Рымскі Іаан Павел Другі. Беларускія гледачы могуць папоўніць спіс шаноўнай публікі славутага калектыву, які лічыцца адным з унікальных — з пункта гледжання рэпертуару і аўтэнтычнасці.

Ансамбль, які быў заснаваны яшчэ ў 1948 годзе прафесарам Тадэвушам Сігетынскім, ставіў перад сабой задачу паказаць польскі фальклор, яго багацце і прыгажосць. Ён марыў яшчэ ў акупаванай Польшчы, што некалі здолее паказаць магутны польскі дух, які жыве ў песні. І ажыццявіў сваю мару з дапамогай усёй краіны. У першы склад трупы ўвайшлі таленавітыя маладыя ўдзельнікі — прафесар правёў тады сур'ёзны кастынг, прагледзеўшы 5000 хлопчыкаў і дзяўчынак па ўсёй краіне, а ў трупу ўзяў 180 чалавек з цудоўнымі галасамі, — спевакоў, якія могуць і танчыць.

Да сённяшніх дзён гэта адна з адметнасцяў калектыву — танцоры, якія спяваюць, і спевакі, якія танцуюць. Рэпертуар ансамбля складаецца з розных польскіх танцаў і народных песень і танцы розных рэгіёнаў Польшчы. Але разынкай, якая падкрэсліла смак, сталі касцюмы. Касцюмы, якімі карыстаюцца артысты ансамбля дагэтуль, самі па сабе з'яўляюцца каштоўнай калекцыяй. На рукавах блузак нават пазначаныя даты іх стварэння, некаторым больш за 100 гадоў. Старадаўнія галаўныя ўборы ды срэбраныя паясы — шык, які па нашых мерках быў бы варты музея... Гадамі збіраліся гэтыя касцюмы, якія з'яўляюцца ўзорамі святочнай народнай вопраткі.

Але было б дзіўна, каб ансамбль, які праехаў 50 краін свету, не натхняўся нейкімі ўзорамі замежнай культуры. Цяпер у калектыве песні на 36 мовах, у тым ліку кітайскай, японскай, арабскай.

Але галоўнае, чаго чакае публіка падчас выступлення Польскага дзяржаўнага народнага ансамбля песні і танца — польскага духу. Менавіта ён у нашым уяўленні ўвасабляецца ў фірменных польскіх танцах, пра якія сёння ведае свет. Напрыклад, мазурка. Гэты народны танец у XVIII стагоддзі стаў прыдворным. Яго любілі гусары, якія мелі магчымасць паказаць сябе перад дамамі. А паходзіць гэты танец з Мазовіі — таго рэгіёна, які даў назву ўсяму ансамблю. Паглядзім, як танцуюць там, дзе нарадзілася мазурка?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Смяротныя сутыкненні...

**У Докшыцкім раёне паблізу вёскі Свіркі жыхар райцэнтра, кіруючы «Опелем», выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з «МАЗам». У выніку аварыі вадзіцель атрымаў траўмы і быў шпіталізаваны, а пасажырка ягонага аўто — 30-гадовая жыхарка Мінска — загінула.**

А ў Бешанковіцкім раёне грамадзянін Расіі, які быў за рулём «МАН», збіў 22-х гадовага пешахода, мясцовага жыхара, які загінуў.

У гарадскім пасёлку Ушачы вадзіцель «Рэно», мясцовы жыхар, сутыкнуўся з 53-гадовым веласіпедыстам, які загінуў.

## Іх слабасць — чужыя аўтамабілі

**У Полацку затрыманы два афіцыйна беспрацоўныя, якія любілі «працаваць», крадучы дабро з чужых аўтамабіляў.**

Спачатку ў міліцыю паскардзілася жанчына, якая паведаміла пра тое, што нехта ноччу разбіў бакавое шкло яе «Пежо» і скраў магнітолу. У тую ж ноч зладзеі падабралі ключы да «Фальксвагена», які належыць яшчэ аднаму жыхару Полацка, і таксама скралі магнітолу. Міліцыянеры затрымалі двух раней судзімых за рабаўніцтва і крадзеж: 22 і 25-гадовага мужчын. Заведзеная крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Журналісцкае расследаванне

ЧАСТКА 2

# Чаму Беларусь не абаранілі ад нашэсця наркатычных «бубак»?



Так выглядаюць паўлегальныя «бубкі»...

Яўген ВАЛОШЫН

**АПРАЦАВАНАЕ опіем насенне маку прадаецца прама на папулярных рынках. У гэтым, правёўшы сваё журналісцкае расследаванне, упэўніўся журналіст «Звязды» (нумар за 26 кастрычніка).**

**«Чаму такое дапускаецца?» — звярнуліся мы да кампетэнтных чыноўнікаў. Аказалася, у некаторых ведамствах таксама б'юць трывогу: «Бубкі» — самы «брудны» і самы папулярны ў Беларусі ін'екцыйны наркотык. Але наша заканадаўства пакуль працуе так, што праваахоўнікі папросту не могуць пакараць наркагандляроў.**

70% беларускіх наркаспажыўцоў — «бубачнікі». Такую лічбу журналісту «Звязды» паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя (звесткі за 2009 год). Пры гэтым уздзеянне апіоідаў, якія вылучаюцца з «бубак», можа прывесці да гібелі.

— Самы страшны эфект — гэта смерць з-за спынення дыхання. Менавіта так паміраюць у перадазіроўцы, — папярэджвае **Алег АЙЗБЕРГ, дацэнт кафедры псіхіятрыі і наркалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі**. — Небяспечны і ўплыў хімічных рэчываў, якія выкарыстоўваюцца падчас прыгатавання наркатычнага раствору, на печань, ныркі і іншыя органы. Раствор утрымлівае апіоіды (кадэін, марфін, монаацэцілмарфін), якія выклікаюць залежнасць, аналагічную гераінавай. Залежнасць абумоўленая моцнай цягай да спажывання наркотыку, фізічным і псіхічным дыскамфортам, калі спрабуеш кінуць.

Пасля змен у дзяржаўным стандарце, што здарылася гэтым летам, людзям стала цяжэй знаходзіць наркотык, яны пачалі часцей звяртацца па медыцынскую дапамогу. Усё больш і больш людзей прыходзяць, каб зняць ломку, некаторыя звяртаюцца ў рэабілітацыйныя цэнтры, каб назаўсёды пазбавіцца ад наркатычнай залежнасці.

Спадзяёмся, што ў бліжэйшы час мы зможам ахапіць назіраннем усё большую колькасць наркаспажыўцоў і прапанаваць ім лячэнне.

***— Падчас падрыхтоўкі матэрыялу я ўпэўніўся, што «бубкі» па-ранейшаму прадаюцца. І на рынках, і праз наркагандляроў...***

— Ніякая мера не прыводзіць да абсалютнага эфекту. Гандаль на рынку забаронены, цяпер справа за кантралёрамі, якія павінны не дазваляць прадаваць і караць парушальнікаў. Але гэтым павінны займацца не мы. Наша справа лячыць. Мы — не змагары, а медыкі.

### Міністэрства ўнутраных спраў: «Як вырашыць праблему, мы ведалі з самага пачатку, але... нашы меры не прайшлі»

Калі гутарка заводзіцца пра гандаль «бубкамі», то абывацель звычайна ва ўсім вінаваціць міліцыю. «Яны павінны штодня класці тварам у асфальт барыг (наркагандляроў — «Звязда»), а замест гэтага дазваляюць такое бяспраўе», — не раз чуў я ад зацікаўленых грамадзян, абмяркоўваючы з імі праблему.

Але ў Міністэрстве ўнутраных спраў хавацца ад журналіста не сталі. Аказалася, тут выдатна разумеюць праблему і ведаюць, як яе вырашыць.

У МУС патлумачылі, што паставіць заслон «бубкам» было магчыма яшчэ ў сярэдзіне 2000-х. Але па гэтым пытанні ўзніклі непаразуменні з іншымі зацікаўленымі ведамствамі.

— Гэта праблема сапраўды сур'ёзная і адна з прыярытэтных. Калі рэгулярна ўжываць опій, саматужна выраблены з насення маку, тэрмін жыцця такога наркамана — ад двух да пяці гадоў, — распавядае **Дзмітрый МЯДЗВЕДЗЕЎ, оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі**. — Першая інфармацыя пра «бубкі» з'явілася з канца 2004 года. Мы адразу ж пачалі гучна заяўляць пра праблему, звярталіся ў разнастайныя органы ўлады. Ёсць думка, што калі справа звязана з наркотыкамі, то вырашыць яе здольныя толькі ў міліцыі. На жаль, гэта не так, гэта агульная праблема. Шэраг органаў павінен быць зацікаўлены ў яе вырашэнні. Не ведаю, чаму так доўга нашы прапановы не маглі пачуць, але толькі з гэтага года мы дабіліся станоўчых змен. Не сакрэт, што насеннем маку гандлявалі на рынках, на вагу. Нават мяхамі закуплялі для далейшай рэалізацыі. Як вы ведаеце, з 26 ліпеня гэтага года ўступілі ў сілу новыя правілы гандлю макам. Сёння па законе прадаваць насенне можна толькі ў пакетах, вага якіх павінна быць не большай за 200 грамаў. Мак павінен быць расфасаваны афіцыйнымі вытворцамі або юрыдычнымі асобамі, якія маюць сертыфікат адпаведнасці на серыйную вытворчасць. Такім чынам мы паспрабавалі абмежаваць распаўсюджанне маку і далейшае яго выкарыстанне для прыгатавання наркотыку.

***— Дзмітрый Анатольевіч, тым не менш наркатычнае насенне маку па-ранейшаму прадаецца. Гэтых мераў недастаткова.***

— Я хачу патлумачыць, што само насенне маку не ўнесена ў рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў. Іх абарот не забаронены. Пераносіць насенне, гандляваць ім магчыма, крымінальнай адказнасці за гэта не прадугледжана.

Праведзеныя даследаванні паказалі, што само насенне маку ўтрымлівае алкалоіды опію ў мізэрнай колькасці, як, напрыклад, трава, лісце, ягады. Наркатычнага эфекту дасягнуць нельга. Але гэтае насенне апрацоўваюць опіем альбо дадаюць у яго макавую саломку. Знешне насенне чыстае, але падчас «варкі» опій выцягваецца, аддзяляецца ад вады шляхам экстракцыі і выкарыстоўваецца.

***— Атрымліваецца, што з «бубак» вырабляюць страшны наркотык, а барыгам пагражае ўсяго толькі адміністрацыйная адказнасць. У гэты ж час яны рэальна дапамаглі пасадзіць на іголку многіх нашых суайчыннікаў...***

— З самага пачатку, калі мы даведаліся пра «бубкі», падымалася пытанне, каб увогуле забараніць продаж насення маку. Пакінуць дазвол на гэта мы прапаноўвалі толькі Дэпартаменту па хлебабулачных вырабах Міністэрства сельскай гаспадаркі. Яны маюць канкрэтных пастаўшчыкоў, якія, у сваю чаргу, прывозяць вельмі «чысты» харчовы мак. Але прапанова не прайшла...

Чаму меры па абароне Беларусі ад «бубак» не прайшлі і якія чыноўнікі паставілі міліцыянерам палкі ў колы, Дзмітрый Мядзведзеў не паведаміў: «Гэта, на жаль, мне невядома».

**ЯК ДЗЕЙНІЧАЦЬ, калі ваша сям'я сутыкнулася з наркотыкамі?**

**У краіне дзейнічае шэраг аўтарытэтных арганізацый, якія дапамагаюць і непасрэдна нарказалежным, і іх сваякам. Усю неабходную інфармацыю вы зможаце атрымаць на сайце narkotiki.by.**

**Таксама прапануем звязацца з прадстаўнікамі РГА «Маці супраць наркотыкаў», якія падкажуць, як вырашыць праблему. Тэлефоны арганізацыі: (017) 293 07 59, (017) 210 07 07, +375 29 677 21 85.**

### Што спрыяе «бубачнай» наркаманіі?

Асобнай структуры па наркакантролі ў нас няма, хоць такія спецыяльныя падраздзяленні даўно створаныя ў суседніх краінах. А ў МУС ёсць толькі ўпраўленне па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі. Структура па ўсёй краіне налічвае ўсяго каля 400 чалавек. З іх — толькі каля 270 змагаюцца непасрэдна з наркотыкамі. Як разумееце, барыг і наркаспажыўцоў у сотні разоў болей.

Пра беларускае заканадаўства асобная гутарка. Маку завозіцца ў краіну колькі хочаш — з Чэхіі, Польшчы, Расіі, Украіны. Прытым на ўвоз насення не трэба ніякіх спецыяльных ліцэнзій. Дазваляе від дзейнасці — вазі колькі хочаш, хоць «бубкі», хоць мак харчовы.

За шэсць гадоў, пакуль наркабароны садзяць на іголку беларускую моладзь з дапамогай «бубак», ніводзін такі пастаўшчык не быў арыштаваны. Акрамя таго, аб'ёмы паставак наркатычных «бубак» невядомыя, пра гэта можна толькі здагадвацца.

У МУС спрабавалі завесці некалькі крымінальных спраў за кантрабанду «бубак». Але заканадаўства пакуль працуе так, што даказаць злачынства амаль немагчыма. Крымінальныя справы збіраюцца прыпыніць.

Усе ведаюць, што насенне маку выкарыстоўваецца як капсула для пастаўкі опію, што кілаграм нармальнага харчовага маку не можа каштаваць 120.000, 150.000 і 200.000 беларускіх рублёў. Але прызнаваць такое насенне наркотыкам не спяшаюцца.

Я звяртаўся ў разнастайныя ведамствы, якія маюць дачыненне да рынкаў, да паставак «маку». І паўсюль кажуць, што пра праблему «бубак» нічога не чулі.

У гэты ж час наркотык, як ужо пісалася, займае топ-радкі ў справе наркатызацыі Беларусі.

Падчас падрыхтоўкі гэтага матэрыялу я не раз чуў пра існаванне «макавага лобі». Але пра канкрэтныя факты я не даведаўся. Мая журналісцкая справа — паказаць сітуацыю, а не выводзіць тых ці іншых людзей на чыстую ваду.

Мяркую, выявіць, хто канкрэтна спрыяе макавым баронам увозіць «бубкі» ў Беларусь, нескладана.

Яшчэ адно меркаванне: некаторыя чыноўнікі праяўляюць банальную легкадумнасць і недасведчанасць у пытаннях наркатычнай небяспекі. І гэта прывяло да трагічных наступстваў.

### Як уратаваць Беларусь ад наркатычнага насення?

Калі дадаць да колькасці беларускіх наркаспажыўцоў нашых алкаголікаў (іх толькі на афіцыйным уліку болей за 180 тысяч чалавек, гэтую лічбу можна памнажаць у некалькі разоў), то вымалёўваецца пагрозлівая карцінка.

Не пабаюся сказаць, што такая сітуацыя рэальна пагражае развіццю беларускай нацыі.

У гэты ж час у некаторых ведамствах, якія так ці інакш звязаныя з праблемай распаўсюджання «бубак», пра наркотык увогуле нічога не ведаюць. І шчыра здзіўляюцца, калі журналіст задае падобныя пытанні.

— Набалелая праблема будзе вырашана толькі тады, калі ўсе ведамствы на справе зразумеюць глыбіню і небяспеку праблемы распаўсюджання «бубак», — лічыць **намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Васіль ЛОСІЧ**. — А для гэтага патрэбна моцная воля чыноўнікаў самага высокага ўзроўню. Калісьці на беларускіх вуліцах мы змаглі выкараніць арганізаваную злачыннасць, бандытызм. Значыць, і гэтай праблеме можна даць рады.

— Сёння жыццёва неабходна звярнуць увагу на «бубкі». І шукаць меры ўсім разам, — прапаноўвае **Ірына ЛУК'ЯНОВІЧ, старшыня грамадскага савета РГА «Маці супраць наркотыкаў»**. — Праваахоўныя органы гатовыя прасоўваць новыя ідэі ў барацьбе з наркаманіяй: займацца прафілактыкай, дапамагаць нам. Мы гатовыя аб'ядноўвацца і бамбіць усе магчымыя інстанцыі, каб гандаль «бубкамі» выразалі пад корань. Інакш нашу краіну чакаюць сур'ёзныя непрыемнасці.

**Наркатычная статыстыка**

**Колькі ў Беларусі сталых наркаспажыўцоў? Калі я пачаў цікавіцца гэтым пытаннем, быў уражаны лічбамі.**

**Паводле звестак Міністэрства аховы здароўя, на ўліку ў наркадыспансэрах — няма і 15 тысяч чалавек.**

**Значыць, пераважная большасць наркаспажыўцоў да медыкаў не трапляе.**

**У 2007 годзе Цэнтр маніторынгу на базе Гродзенскага дзяржаўнага медуніверсітэта правёў даследаванне наконт рэальнай лічбы наркаспажыўцоў — каля 85 000 чалавек.**

**— Наша лічба па наркаспажыўцах — 140 тысяч, не менш, — запэўнівае Ірына Лук'яновіч, старшыня грамадскага савета РГА «Маці супраць наркотыкаў». — У міліцыі гэтыя лічбы пацвярджаюць. Нядаўна да нас па дапамогу звярнулася залежная дзяўчынка. Яна мне сказала: «Вы не ўяўляеце: я, калі пачала спажываць, трапіла ў другое жыццё. З жахам убачыла, колькі людзей звязана з наркотыкамі. На кропцы, дзе купляла, сустракала сваіх аднакласнікаў, суседзяў, на якіх ніколі б не падумала...»**

**Колькі зарабляе дробны барыга?**

**Кілаграм «бубак», які закупляюць наркапастаўшчыкі за мяжой, каштуе ад 1,5 да 3 долараў ЗША. Гэта звесткі Упраўлення ААН па наркотыках і карупцыі.**

**З улікам дастаўкі ў Беларусь кілаграм абыходзіцца максімум у шэсць долараў ЗША (каля васямнаццаці тысяч беларускіх рублёў). Дробны барыга плаціць за кілаграм «бубак» каля 40 тысяч беларускіх рублёў.**

**Калі ўлічыць, што атруту ён потым прадае мінімум па 120 тысяч, то на адным кілаграме барыга наварвае 80 тысяч рублёў. А на адным 25-кілаграмовым папяровым мяху за суткі можна зарабіць аж 2 мільёны беларускіх рублёў. Атрымліваецца, што ў месяц можна лёгка мець пад 60 мільёнаў рублёў (каля 19700 долараў ЗША). І гэта чысты навар дробнага барыгі.**

**Уявіце сабе, колькі маюць буйныя наркапастаўшчыкі...**



Гэта толькі тыя беларускія наркаспажыўцы, якіх выпадкова зняла відэакамера карэспандэнта «Звязды». У сапраўднасці іх ад 85 да 140 тысяч чалавек і больш.

# СУМЕСНЫ ЎВАХОД У ХАТУ

● Вельмі вялікае значэнне надавалася першаму сумеснаму ўваходу маладых у хату. Бацькі сустракаюць маладых ля парога. Уваход у рэстаран ці сталовую не можа замяніць парог роднай хаты і не можа быць месцам для выканання сакральнага рытуальнага дзеяння. Тым часам бабуля ці хтосьці іншы кладзе на парог новы адамкнёны замок, зверху закрывае яго ручніком. Жаніх бярэ нявесту на рукі, становіцца на адно чырвонае поле ручніка (яно знаходзіцца перад парогам хаты) і пераносіць цераз парог, становячыся на другое чырвонае поле: яно знаходзіцца ўжо ў прасторы хаты. У космасе традыцыйнага жылля парог з'яўляўся ні чым іншым, як зонай смерці, таму неабходна было абсалютна выключыць магчымасць дотыку, дакранання нявесты.

● Як толькі маладыя пераступяць цераз парог, ручнік скручвала бабуля і замыкала замок. Пры гэтым ключы аддавалі бацькам жаніха, а замок — бацькам нявесты. Сімволіка гэтага рытуальнага дзеяння простая і зразумелая: як ніхто не зможа адамкнуць гэты замок, так ніхто не ў сілах будзе разлучыць гэтую сям'ю.

● У некаторых выпадках сама нявеста, як толькі аказвалася ў прасторы хаты, хутка падымала ручнік — тым самым паказвала ўсім прысутным, што па гэтай «пераправе» з яе мужам больш ніводная жанчына не пойдзе.

● Усё вяселле маладыя сядзелі пад абразамі, прымаючы ўсю святасць сакральнага месца — чырвонага кута. Тым самым ужо з першай хвіліны закладвалася, мадэлявалася перспектыва новай сям'і: яны з павагай будуць ставіцца да бацькоўскай хаты, але з часам створаць свой «чырвоны кут» — пабудуюць сваю хату!

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Мы ўчора на шашлыкі ездзілі. Але грошай на мяса не было. Таму ўзялі толькі гарэлку.**

☺

Ноч, стук у дзверы. Трывожны жаночы голас:

— Хто там?

— Паручнік Ржэўскі, мадам!

— Зноў будзеце гадасці казаць і да мяне заляцацца?

— Вядома!

— Пачакайце, знайду ключык...

☺

**Народны мачагонны сродак: дзве рэдзькі, бацвінне шчаўя, папараць і лісце ядлоўцу здрабніць і выпіць восем куфляў піва.**

☺

Пацыентка на прыёме ў псіхолага:

— Доктар, мы з мужам ніколі не сварымся.

— Дзіўна... Значыць, вы не створаныя адзін для аднаго.

☺

**Ёсць два спосабы спрачацца з жанчынай, але ніводзін не дапамагае.**




## У падвале шматпавярховіка...

16-гадовая жыхарка Баранавіцкага раёна паскардзілася ў міліцыю на тое, што яе згвалтаваў у падвале шматпавярховага дома знаёмы хлопец.18-гадовага знаёмага затрымалі і цяпер высвятляюцца ўсе абставіны гэтай справы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Палкай ды ў лоб

Да 54-гадовага беспрацоўнага з в. Блювінічы (Брэсцкі раён) зазірнуў 26-гадовы госць. Калі выпілі, успыхнуў скандал, і гаспадар, схапіўшы палку, праламаў госцю лоб. Пацярпелы апынуўся ў бальніцы, а з гаспадаром будуць разбірацца следчыя.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ЗДАБЫЛІ ДЗІКА З КАМБАЙНА?

**ПРА незаконнае паляванне на кукурузным полі паблізу вёскі Дафарэнцыя Мінскага раёна работнікам Мінскай аблінспекцыі паведаміў тутэйшы паляўнічтвазнаўца.**

На месцы дзяржінспектары ўстанавілі, што дзік здабыты зброевым спосабам, як мяркуецца, з камбайна, што праводзіў уборку кукурузы. У гэтай сувязі разглядаецца пытанне пра завядзенне крымінальнай справы за незаконнае паляванне, здзейсненае з выкарыстаннем механічных транспартных сродкаў.

А работнікам Лоеўскай міжрайінспекцыі паведамілі, што адзін з жыхароў вёскі Астравы Лоеўскага раёна прадае мяса дзічыны. Падчас разбору з удзелам оперупаўнаважанага крымінальнага вышуку было ўстаноўлена: даглядчык жывёлы КСУП «Малінаўка-Агра» з дапамогай незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы (якую потым ён добраахвотна здаў) незаконна здабыў дзіка. Шкода ацэненая ў 2,1 мільёна рублёў, магчыма, будзе заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Витебскмебель»**

**Лот:** Производственное здание Цех № 1 площ. 6210,6 кв.м, производственное здание Цех № 2 площ. 11560,8 кв.м, производственное здание «Сушилка» площ. 764,6 кв.м, производственное здание «Механические мастерские» площ. 294,7 кв.м, склад РСГ площ.107,5 кв.м, производственное здание лесопильного цеха площ. 1077,8 кв.м, склад-сарай сухих мебельных заготовок площ. 467,4 кв.м, здание КНС площ. 45,4 кв.м, здание гаража площ. 515,3 кв.м, склад-сарай сырых мебельных заготовок площ. 379,7 кв.м, производственное здание «Обойный цех» площ. 2583,6 кв.м, здание медпункта площ. 378,0 кв.м, здание административно-бытовое площ. 623,0 кв.м, производственное здание энергоблока площ. 1022,0 кв.м, производственное здание «Энергоцех» площ. 161,0 кв.м, здание котельной площ. 1089,8 кв.м, 7/25 доли капитального строения (малого гаража) площ. 222,3 кв.м, эстакада площ. 84,0 кв.м, здание насосной площ. 35,5 кв.м, внутриплощадочные сети электроснабжения протяженностью 4734,0 м, внеплощадочные сети электроснабжения протяженностью 1700,0 м, наружный водопровод протяженностью 739,2 м, канализационно-ливневая сеть протяженностью 1162,9 м, хозяйственно-бытовая канализационная сеть протяженностью 1928,6 м, трубопровод тепловой сети протяженностью 1588,5 м, трубопровод горячего водоснабжения пл. 922,8 кв.м, трубопровод тепловой сети протяженностью 284,2 м, сеть технологических трубопроводов протяженностью 952,1 м, строительные материалы, использованные на возведение следующих объектов: здания склада, здания неустановленного назначения (бытовки), здания котельной (переоборудование склада ЛВЖ), хлораторных, очистных сооружений, сооружения неустановленного назначения (очистное сооружение), сооружения для сбора мусора, противопожарного водоема, пожарного резервуара, наружной сети освещения и ограждения железобетонного и прочие основные средства и товарно-материальные ценности ОАО «Витебскмебель» (перечень опубликован на сайте **www.Ocenka.by**), начальная цена продажи с учетом НДС **3 770 093 345** рублей. Имущество расположено по адресу: Витебск, ул. Ак. Павлова, 48. Для обслуживания вышеуказанных объектов недвижимости выделены земельные участки общ. площ. 7,6204 га. С техническими характеристиками объектов можно ознакомиться у Организатора торгов и Продавца.

Официальное извещение опубликовано в Бюллетене «Конкурсные торги в Беларуси и за рубежом» от 06.10.2009 года № 37.

Аукцион состоится **26 ноября 2010 года в 10.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления принимаются в рабочие дни по 25.11.2010 (включительно) с 8.00 до 17.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников проводится в день проведения аукциона с 09.30 до 10.00 по месту проведения аукционных торгов.

***Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02; www.Ocenka.by***

## ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ИМ. Н. ГАСТЕЛЛО»,

**220073, Г. МИНСК, УЛ. ПИНСКАЯ, 18**

***ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ***

Собрание состоится **8 ноября 2010 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества.** Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 15.00 до 15.55.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О досрочном прекращении полномочий члена Совета директоров ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» и избрании члена Совета директоров.

2. О приобретении ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» акций, им выпущенных.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 1 ноября 2010 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

УНП 100010116

## ФИЛИАЛ «ЦЕНТР БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 04 ноября 2010 г. в 15.00 СОСТОЯТСЯ

**ОТКРЫТЫЕ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ по продаже незавершенного строительством комплекса зданий и сооружений, расположенного в г. Бобруйске по ул. Энергетиков, 5 (предмет торгов) в составе:**

**ЛОТ № 1:** незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3795 (административно-бытовой корпус) пл. 1941,8 кв.м; незавершенное законсервир. кап.строение с инв. № 710/С-3797 (вспомогательный корпус) пл. 2776,3 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3796 (производственный корпус) пл. 5386 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3798 (заправка) пл. 87 кв.м; незавершенное кап. строение (очистное сооружение литер 5Б) пл. 14,67 кв.м; незавершенное кап.строение (очистное сооружение литер 4Б) пл. 14,78 кв.м; ограждение ж/бет. площадью 2244 кв.м. с воротами металлическими площадью 12,6 кв.м; незавершенные строительством сооружения: покрытие бетонное пл. 2550 кв.м, резервуары установки пожаротушения пл. 32,5 кв.м, грязеуловители, внутриплощадочные тепловые сети.

| | |
|---|---|
| **Продавец (собственник)** | **Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217** |
| **Организатор торгов** | **Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509** (р/с 3012035310012 в ф-ле ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | **г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»** |
| **Начальная цена продажи** | **4 761 032 330 рублей без учета НДС, размер задатка - 238 051 620 рублей** |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа ОАО «Белшина» — р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000** |
| **Площадь земельного участка** | 5,9884 га, правовой режим – право постоянного пользования |
| **Условия продажи** | аукцион без условий |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Срок и условия оплаты** | определяются по согласованию Победителя торгов с Продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | **включительно по 03 ноября 2010 г. до 16.00** |

****Более подробная инф. об условиях участия в торгах, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» № 185 (26793) от 22.09.2010 г.***

**Получить дополнительную инф. о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

## Информация о проведении аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | - главный корпус здания для мехмастерских, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1, инв. № 1002, общей площадью 2121,3 кв. м, год постройки – 1980. **Начальная цена 802 772 100 рублей.** - здание мехмастерских, инв. № 1006, расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1, общей площадью 689,3 кв. м, год постройки – 1986. **Начальная цена 292 615 200 рублей.** - профилакторий для ремонта автокранов, инв. № 1005, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1, общей площадью 98,6 кв. м. **Начальная цена 48 230 100 рублей.** - производственный пункт заправочной станции, инв. № 2059, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1, общей площадью 5 кв. м, год постройки – 1981. **Начальная цена 2 902 500 рублей.** - здание материального склада, инв. № 1001, расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1, общей площадью 152,2 кв.м, год постройки – 1972. **Начальная цена 53 519 400 руб.** - склад готовой продукции, 5-й полигон (с пропарочной камерой), расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 1, общей площадью 2301,0 кв. м, год постройки – 1989. **Начальная цена 171 766 980 рублей.** |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Сумма задатка** | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 15.11.2010 г. до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 75 16 09, 75 19 20 (факс) |
| **Дата, время и место аукциона** | 16.11.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, СИКУП «УКС-СЕРВИС» |

# «НАШ ШЛЯХ — НАРОДНЫ КАПІТАЛІЗМ»

Дыскусійная трыбуна

**Лібералізацыя эканомікі і яе магчымыя наступствы — тэма гутаркі нашага карэспандэнта з вядомым беларускім эканамістам і аналітыкам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. ЗАІКАМ.**



***— Відаць, пасля падпісання Прэзідэнтам дырэктывы № 4 аб далейшай лібералізацыі эканомікі, праект+ якой зараз дапрацоўваецца, у эканамічным жыцці краіны трэба чакаць цікавых перамен. Чым яны выкліканыя?***

— Можна сказаць, што мы знаходзімся ў пачатку этапу новага жыцця.

Працяг лібералізацыі абумоўлены неабходнасцю новых падыходаў у эканамічнай палітыцы. У прыватнасці, у ходзе будучай прыватызацыі некаторыя буйныя прадпрыемствы неўзабаве пяройдуць да канкрэтных уласнікаў. Лібералізацыя і прыватызацыя ідуць побач, нас, на мой погляд, чакае маштабны падзел дзяржаўнай уласнасці, пераход прадпрыемстваў у прыватныя рукі.

***— Як нам пазбегнуць тых часам свядомых і несвядомых пралікаў, якія адбываліся ў час нярэдка «бандыцкай» прыватызацыі ў Расіі? Там, як вядома, гаспадарамі рэнтабельных і высокапрыбытковых вытворчасцяў станавіліся людзі, якія раней да іх мелі ў лепшым выпадку ўскоснае дачыненне.***

— Калі быць шчырым да канца, то я не вельмі ўпэўнены ў тым, што мы здолеем пазбегнуць расійскіх памылак. Я думаю, што частка цяперашняй эканамічнай эліты краіны абавязкова паспрабуе ўключыцца ў шматабяцальны для спрытных і кемлівых чыноўнікаў працэс падзелу дзяржаўнай уласнасці. І тут варта не страчваць пільнасць, каб за размовамі пра лібералізацыю эканомікі не прапусціць няхай і цывілізаваны, але захоп нашай прамысловасці. Мяне непакоіць той факт, што ў Беларусі знікла грамадская ўласнасць. Зараз пра яе ўвогуле ніхто не гаворыць, хоць яна стваралася намаганнямі беларускага народа на працягу 70 гадоў. Размовы ідуць толькі пра дзяржаўную ўласнасць. Быццам бы грамадская ўласнасць кудысьці знікла. А грамадская і дзяржаўная ўласнасць, як гавораць у Адэсе, — гэта дзве вялікія розніцы.

***— Прабачце, але любіце вы тэрмінамі часам жангліраваць. Навошта?***

— Прычым тут гэта? Я — усё ж эканаміст, і лічу, што мы прайшлі працэс пераўтварэння грамадскай уласнасці ў дзяржаўную, якая зараз (ёсць прычыны так думаць) пяройдзе ў стан прыватнай. Нагадаю, Расія і Украіна праходзілі лібералізацыю па-свойму. А яна закончылася прыватызацыяй дзяржаўных прадпрыемстваў. У выніку ў гэтых краінах была сфарміраваная буйная прыватная ўласнасць. Прычым яна стала належыць пераважна тым, у каго на той момант была эканамічная ўлада. У Расіі асобныя ўдзельнікі прыватызацыі казачна абагаціліся. Напрыклад, Брынцалаў, які некалі прыязджаў да нас, зараз у сваё задавальненне жыве ў Манака, катаецца там на шыкоўным «майбаху».

Вядомы ліберал і прыхільнік дэмакратычных каштоўнасцяў чэх Вацлаў Гавел у адным з апошніх інтэрв'ю прызнаецца ў сваёй былой эканамічнай наіўнасці. Па яго словах, ён не да канца ўяўляў сабе, як будзе праходзіць пасля «аксамітнай» рэвалюцыі прыватызацыя ў Чэхаславакіі. А яна прайшла на карысць эканамічнай наменклатуры. Аніякай дэмакратычнай прыватызацыі на радзіме Гавела, дзе ён быў прэзідэнтам, не адбылося. Там эканамічная і палітычная эліта падзялілі паміж сабой дзяржаўную ўласнасць. А народ апынуўся ў ролі пасіўнага назіральніка.

Я хачу адзначыць, што мы зараз знаходзімся на прынцыповай стадыі свайго існавання: з'явіцца ў нас алігархічны капіталізм ці мы пойдзем па больш гуманістычнаму шляху.

***— Што можна і трэба зрабіць, каб лібералізацыя эканомікі і наступная за ёй прыватызацыя прайшлі з меншымі праблемамі?***

— Спачатку ўважліва прыглядзецца да досведу кітайскіх камуністаў. Яны прыкладна дваццаць гадоў не прыватызавалі дзяржаўную ўласнасць. Яна, дарэчы, у іх лічыцца грамадскай і ў значнай ступені з'яўляецца агульнанароднай. Кітайцы, згодна з вучэннем Леніна, у пачатку сваіх слынных рэформаў пачалі актыўна развіваць малы і сярэдні бізнэс, які штодзень нараджаў капіталізм. Інакш кажучы, у Кітаі стварайся рынак на ўласнай аснове: прадпрымальнікі на сваю рызыку адкрывалі дробныя прадпрыемствы, ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі заваёўвалі замежныя рынкі збыту і назапашвалі ўласны капітал. Ніхто з высокапастаўленых партыйных функцыянераў і чыноўнікаў не меў права займацца прыватызацыяй на сваю карысць ці карысць членаў сям'і, блізкіх і дальніх сваякоў.

І вось, калі ў Кітаі з'явілася шмат прыватных фірмаў і прадпрыемстваў, тады ў Пекіне вырашылі акцыяніраваць частку дзяржаўнай уласнасці. Я думаю, што такі шлях быў бы рацыянальны і для нашай краіны. А лібералізацыя яе эканомікі, па вялікім рахунку, патрэбна ў першую чаргу для таго, каб зрабіць людзей гаспадарамі. Няхай і ў нас капіталізм таксама развіваецца на аснове станаўлення малога і сярэдняга бізнэсу.

У час маёй работы ў Кітаі я пазнаёміўся з маладым хлопцам, які чамусьці называў сябе Міхаілам Ламаносавам. У сферы гандлёвага бізнэсу ён праявіў сябе як сапраўдны Ламаносаў: пачынаў з гандлёвай палаткі памерамі два на два метры, а зараз валодае сучасным двухпавярховым гандлёвым цэнтрам. «Ламаносаў» — доларавы мільянер, хаця нічога з дзяржаўнай уласнасці не прыватызаваў. У нас, на жаль, такі народны капіталізм пакуль не атрымаў належнага развіцця.

***— Не зусім згодны з вамі. У нас амаль 70 працэнтаў малога і сярэдняга бізнэсу — гандаль. Дарэчы, чаму?***

— Я зноў спашлюся на класіка — Карла Маркса, які ў свой час быў лепшым экспертам па капіталізме. Ён прыйшоў да высновы, што яго самая першая стадыя — гандлёвы капітал. І сёння ў многіх краінах, якія пераходзяць да капіталізму — у тым ліку і былога сацыялістычнага лагера — усё пачынаецца з гандлю. «Новыя» рускія, украінцы і беларусы свой першы капітал робяць пераважна на гандлі — не важна чым, галоўнае, каб быў прыбытак. Ужо потым пераходзяць да вытворчасці.

***— Ведаеце, гандаль — вельмі рызыкоўная сфера дзейнасці. Колькі бізнэсменаў пачаткоўцаў «згарэла» ў ёй! А чаму б адразу не заняцца вытворчасцю, бо не ў кожнага прадпрымальнага чалавека ляжыць душа да гандлёвых аперацый.***

— Каб заняцца вытворчасцю, патрэбна недзе ўзяць грошы на яе станаўленне і першапачатковае развіццё. Свабодныя і немалыя грошы ёсць далёка не ў кожнай сям'і.

***— Але чаму б не ўзяць сродкі ў банку ў выглядзе крэдыту на пэўны тэрмін, зарабіць грошы і потым разлічыцца з банкам? Гэта ж агульнапрынятая ў свеце практыка.***

— Так толькі на першы і не заўсёды дасведчаны погляд. Я, напрыклад, на аснове вывучэння многіх эканамічных праектаў пераканаўся ў тым, што самы эфектыўны бізнэс пачынаецца з уласных грошай ці пазычаных у сваякоў, сяброў, калег. Такія грошы, як правіла, іх часовымі ўласнікамі вельмі ашчадна выкарыстоўваюцца. А вось узятыя ў банку крэдыты часта легкадумна выдаткоўваюцца без аглядкі на тое, што хутка крэдыт з працэнтамі прыйдзецца вяртаць. Нярэдка малады ці сярэдняга ўзросту чалавек бярэ крэдыт на гаспадарчае развіццё, а замест тэхнікі ці ўзвядзення невялікага цэха, склада ў першую чаргу купляе дарагі джып у аўтасалоне. А як жа, ён цяпер паспяховы бізнэсмен — «круты», адным словам. Няхай зайздросцяць знаёмыя, суседзі! А затым пачынаюцца спрэчкі з банкам, часам уцёкі з рэшткамі крэдыту і г. д. А ўсё таму, што банкаўскія грошы часта ўспрымаюцца як чужыя. Такі, на жаль, наш славянскі менталітэт. Таму насуперак рэкламе банкаў, што іх крэдыты — ключ да поспеху для любога дзелавога чалавека, я заклікаю бізнэсменаў будаваць капіталізм на ўласнай аснове.

***— Дакладней, калі ласка.***

— Такі капіталізм стварае новыя працоўныя месцы, абвастрае канкурэнцыю, што спрыяе зніжэнню цэн на многія тавары. Апошнія два месяцы я правёў шмат часу ў Польшчы, Літве, ва Украіне і Расіі. Вядома, назіраў, вывучаў розныя аспекты рынкавай эканомікі ў гэтых краінах. На мой погляд, лепш за ўсё малы бізнэс уплывае на жыццё сваіх грамадзян у Польшчы і ва Украіне. Там рэальна падаюць цэны на многія тавары. Палякі маюць магчымасць набываць недарагія прадукты харчавання, якія выпускаюць малыя прадпрыемствы. І нам трэба было б, дарэчы, больш уважліва прыглядзецца да досведу Польшчы. Праўда, у іх даўнія традыцыі выкарыстання прыватнай уласнасці — напрыклад, зямлі. Таму і нам можна пачаць прадаваць зямлю ва ўласнасць.

Дарэчы, пра гэта гаварыў і Прэзідэнт, звяртаючыся да чыноўнікаў: «Ну прадайце яму зямлю! Чаго вы баіцеся?» Але мясцовая наменклатура не хоча гэтага, супраціўляецца, часам процідзейнічае лібералізацыі ў вёсцы, у пасёлках, малых і сярэдніх гарадах. Такім чынам атрымоўваецца, што ёсць імкненне Прэзідэнта развіваць і пашыраць лібералізацыю — і ёсць, магчыма, не заўсёды наўмыснае жаданне прытармазіць гэты працэс, зацягнуць яго.

***— Мясцовая наменклатура — гэта частка народа. Якім чынам яна можа, на вашу думку, удзельнічаць у пераразмеркаванні дзяржаўнай уласнасці?***

— Гэта складанае пытанне. Мне цяжка ўявіць, што дырэктары і члены кіраўніцтва заводаў, асобныя прадстаўнікі раённых і абласных уладаў упусцяць свой шанц прыхапіць кавалак дзяржаўнай уласнасці, магчымасць стаць доларавым мільянерам. Таму трэба пагадзіцца з тым, што частка наменклатуры будзе мець права на ўдзел у прыватызацыі. Але пры ўмове: толькі тады, калі ў раёне, вобласці дастаткова разаўецца малы бізнэс.

**За размовамі пра лібералізацыю эканомікі не прапусціць няхай і цывілізаваны, але захоп нашай прамысловасці.**

***— А як вымяраць гэту дастатковасць?***

— Проста. Скажам, калі ў пэўным раёне 50 працэнтаў аб'ёму вытворчасці прыходзіцца на прыватны сектар, то тады можна дазволіць кіраўніцтву раёна ўдзельнічаць у прыватызацыі. Зноў хачу спаслацца на Кітай, досвед якога багаты на розныя прыклады. Дык вось адна кітайская дзяўчына — студэнтка леса-тэхналагічнага каледжа — пачала шыць танную вопратку для моладзі. Спачатку сама сядзела за швейнай машынкай, потым наняла людзей. Справа пайшла, нягледзячы на тое, што ўвесь свет, як і сам Кітай, завалены таннай прадукцыяй кітайскай лёгкай прамысловасці. За некалькі гадоў дзяўчына стала мільянершай. Так што стварэнне ўласнай перспектыўнай вытворчасці заўсёды мае перспектыву для раёна.

***— Адначасова з дырэктывай № 4 рыхтуецца Закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Навошта ён патрэбен?***

— Лібералізацыя — гэта, паўтаруся, стварэнне ўмоў для больш актыўнага развіцця прыватнага бізнэсу. Яго ўдзел у распрацоўцы вышэйназванага Закона — спроба паўдзельнічаць у барацьбе за атрыманне дзяржаўных заказаў буйных заводаў, як, напрыклад, МТЗ, МАЗ і іншыя. Бо не сакрэт, што да супрацоўніцтва з малымі і сярэднімі прыватнымі вытворцамі дэталяў, камплектуючых дзяржаўныя гіганты індустрыі, прадпрыемствы меншага калібру ставяцца не тое што падазрона, але як да не вельмі пажаданых партнёраў. Таму пасля ўступлення ў сілу гэтага Закона, думаю, гэтая ненармальная сітуацыя зменіцца: малыя і сярэднія прыватныя вытворцы будуць актыўна ўдзельнічаць у вытворчай кааперацыі з вядучымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі.

Хаця тут ёсць і другі бок медаля. Мне здаецца, што шэраг нашых бізнэсменаў, нават іх вялікая колькасць, хочуць, нібы рыбы-прыліпалы, шчыльна прытуліцца да буйных заводаў і такім чынам мець, дзякуючы іх заказам, гарантаваны заробак на пастаўках дэталяў, аказанні паслуг. Хоць гэта не зусім добра. Тут павінна быць канкурэнцыя. Гэта калі ваша, умоўна скажам, гайка лепшая па якасці і прымальная па цане, то яе і варта набываць гіганту індустрыі, а не тую гайку, якую выпускае ўдзельнік нейкай там дамовы, няхай важнай дзяржаўнай праграмы. У такога прыватніка не будзе моцных стымулаў павышаць канкурэнтаздольнасць сваёй прадукцыі.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.00 | 17.46 | 9.46 |
| Віцебск — | 7.53 | 17.33 | 9.40 |
| Магілёў — | 7.50 | 17.37 | 9.47 |
| Гомель — | 7.43 | 17.37 | 9.54 |
| Гродна — | 8.14 | 18.02 | 9.48 |
| Брэст — | 8.11 | 18.06 | 9.55 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 30 кастрычніка. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Праскоўі, Мікалая, Назара, Пратаса, Селівана.*

***К.*** *Зоі, Івоны, Сабіны, Вінцэнта, Пятра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РНП серии БЛ № 0022491—0022492 считать недействительными.
УНП 101883943

# БАР'ЕР ДЛЯ НЕБЯСПЕЧНЫХ ВЫКІДАЎ

## Перашкодай для ненаўмыснага ўтварэння стойкіх арганічных забруджвальнікаў з'яўляюцца новыя тэхналогіі

**Хваробы нервовай і гарманальнай сістэм, анкалогія, прыроджаныя паталогіі ў дзяцей — вось толькі некаторыя і па-сапраўднаму сумныя вынікі ўздзеяння хімічных спалучэнняў, што належаць да групы стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Нездарма ва ўсім свеце САЗ прызнаныя адной з найбольш значных пагроз чалавецтву, якая патрабуе неадкладных захадаў па яе ліквідацыі. Прычым гаворка не толькі пра выяўленне стойкіх арганічных забруджвальнікаў, ачыстку ад іх пэўных тэрыторый і экалагічна бяспечнае захоўванне звышшкодных адходаў. Не менш важнай прызнаная і іншая задача — рэгуляванне выкідаў стойкіх арганічных забруджвальнікаў і, у прыватнасці, ненаўмысных выкідаў САЗ, што ўтвараюцца падчас некаторых прамысловых і тэхналагічных працэсаў.**

### «ШКОДНЫ» СПІС. З ПРАЦЯГАМ

Стварэнне пахаванняў непрыдатных пестыцыдаў і іх перапрацоўка, абясшкоджванне глебы, інвентарызацыя і вывад з выкарыстання трансфарматараў і кандэнсатараў, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы — напрамкі, безумоўна, значныя. Аднак для мінімізацыі ўздзеяння стойкіх арганічных забруджвальнікаў не меншае значэнне мае праблема наўмысных ці ненаўмысных выкідаў падчас тэхналагічных працэсаў поліхларыраваных дыбензадыяксінаў і дыбензафуранаў.

— Поліхларыраваныя дыбензадыяксіны і дыбензафураны аднесены да найбольш небяспечных сінтэзаваных стойкіх арганічных забруджвальнікаў Стакгольмскай канвенцыяй аб САЗ 2001 года, да якой сярод іншых краін далучылася і Беларусь, — распавядае начальнік упраўлення рэгулявання ўзаемадзеянняў на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей Заўялаў. — Разам з тым варта нагадаць пра існаванне Пратакола па САЗ да Жэнеўскай Канвенцыі аб трансмежным забруджванні паветра на вялікія адлегласці. У параўнанні са Стакгольмскай канвенцыяй колькасць стойкіх арганічных забруджвальнікаў, выкіды якіх павінны падлягаць рэгуляванню, у гэтым Пратаколе крыху шырэй. Напрыклад, Пратакол па САЗ да Канвенцыі аб трансмежным забруджванні паветра на вялікія адлегласці вызначае неабходнасць рэгулявання поліцыклічных араматычных вуглевадародаў, гексахлоргексана і гексахлорбензола, а апроч таго, разглядаецца пытанне аб павелічэнні гэтага пераліку за кошт іншых рэчываў, якія ўтрымліваюць хлор.

На сёння Беларусь бокам Пратакола па САЗ да Канвенцыі аб трансмежным забруджванні паветра на вялікія адлегласці не з'яўляецца. Тым не менш, наша краіна мае намер да яго далучыцца, і ў сувязі з гэтым разам з Расійскай Федэрацыяй і Казахстанам распрацоўвае пакрокавыя планы дзеянняў на перспектыву. Пры гэтым зразумела: у выніку далучэння да Пратакола па САЗ Беларусь возьме на сябе абавязкі не перавысіць выкіды стойкіх арганічных забруджвальнікаў або скараціць іх колькасць праз пэўны час у параўнанні з вызначаным базавым годам. І ў тым ліку поліцыклічных араматычных вуглевадародаў, гексахлоргексана і гексахлорбензола.

Дарэчы, вельмі адметны нюанс: на сёння ў нашай краіне ўжо распрацаваныя гранічна дапушчальныя канцэнтрацыі ў атмасферным паветры па шэрагу стойкіх арганічных забруджвальнікаў — у прыватнасці, па тых жа дыбензадыяксінах, дыбензафуранах, поліцыклічных араматычных вуглевадародах. А ў планах на заўтра — мець добрую зыходную інфармацыю аб крыніцах небяспекі ў выглядзе кадастру.

— Каб добра ўяўляць колькасць стойкіх арганічных забруджвальнікаў, неабходна метадалогія ацэнкі, — заўважае Сяргей Заўялаў. — Такую метадалогію на працягу некалькіх апошніх гадоў мы распрацоўваем сумесна з Інстытутам прыродакарыстання Нацыянальнай Акадэміі навук — разглядаюцца варыянты як разліковых метадаў, так і метадаў, заснаваных на натурных вымярэннях адпаведных крыніц забруджвання.

**ДРОВЫ ТРЭБА ДОБРА ПАСУШЫЦЬ**

**Нізкатэмпературная асаблівасць печкі — факт, зразумела, адмоўны. Тым не менш, знізіць верагоднасць недапалу і ўтварэння стойкіх арганічных забруджвальнікаў можна — для гэтага неабходна выкарыстоўваць сухія і без ледзяшоў дровы. Нездарма нашы продкі мелі добрую завядзёнку: перад выкарыстаннем дровы высушвалі два гады.**

**ЧАМУ ПАЛІЦЬ САЛОМУ ГРЭЧКІ НЕЛЬГА?**

**Назапашванне хлору ў раслінах адбываецца па-рознаму, і кожная культура мае свае асаблівасці. Напрыклад, салома добра нам усім вядомай грэчкі ўтрымлівае да 0,1 працэнта хлору — нашмат больш, чым салома жыта ці пшаніцы. Таму ёсць падстава добра падумаць перад тым, як салому грэчкі паліць.**

### АДКУЛЬ ЗЫХОДЗІЦЬ НЕБЯСПЕКА?

Адным з вельмі распаўсюджаных шляхоў выкідаў стойкіх арганічных забруджвальнікаў не без падстаў лічыцца вытворчасць чорных і каляровых металаў. Рэчывы з утрыманнем хлору могуць выкарыстоўвацца падчас другаснай плаўкі алюмінію для паляпшэння якасці металу. З'яўленне шкодных выкідаў цалкам верагоднае і пры другаснай плаўцы металалому. У ломе могуць заставацца розныя маслы з утрыманнем хлору, а сам лом можа быць пафарбаваным — а некалі дастаткова шырока выкарыстоўваліся фарбы з утрыманнем таго ж хлору.

Зрэшты, казаць, што ўласная металургічная вытворчасць істотна ўплывае на сітуацыю з выкідамі стойкіх арганічных забруджвальнікаў у Беларусі, не выпадае. У краіне даволі актыўна вядзецца падрыхтоўка лому, што дазваляе практычна выключыць выкарыстанне рэчываў з утрыманнем хлору ў працэсе плаўкі. Таму асноўная небяспека зыходзіць зусім з іншага боку. Паводле ацэнак экспертаў, да 90 працэнтаў ненаўмысных выкідаў САЗ дае спальванне арганічных рэчываў — з утварэннем у якасці пабочных прадуктаў хлорарганічных хімікатаў.

Тэма спальвання аўтамабільных шын «на слыху» дастаткова даўно. Дзякуючы даследаванням навуковых устаноў Еўропы і ЗША вядома, што пры гэтым могуць утварацца дыяксіны. Нашмат менш у поле ўвагі большасці з нас трапляе цвёрдае бытавое паліва. Яно мае раслiннае паходжанне, пры гэтым расліны ў той або іншай ступені здольныя паглынаць з глебы хлор. Як вынік, як натуральны элемент хлор утрымліваецца ў драўніне, торфе, вугалі.

Нарэшце, нельга не ўзгадаць пра спальванне цвёрдых бытавых адходаў. Гэта — яшчэ адзін са шляхоў ненаўмысных выкідаў САЗ.

### ТЭМПЕРАТУРА — ФАКТАР РЫЗЫКІ

Меркаванне, што падчас спальвання пазбегнуць шкодных выкідаў усё роўна нельга, памылковае. Сапраўды, хлорутрымліваючыя элементы ў некаторай прадукцыі, паліве, адходах — рэч натуральная. Зрабіць з гэтым нічога немагчыма. Аднак звесці да мінімуму ненаўмысныя выкіды стойкіх арганічных забруджвальнікаў ужо цалкам рэальна. І гэта — справа тэхналогій.

Пра перавагі традыцыйнай печкі сказана вельмі шмат. Аднак менш вядома тое, што печка з-за дастаткова нізкай тэмпературы спальвання — ці не найгоршае прыстасаванне.

— Пры нізкай тэмпературы існуе недапал, у выніку чаго могуць атрымлівацца тыя ж поліцыклічныя араматычныя вуглевадароды, — адзначае Сяргей Заўялаў. — Таму перавага павінна аддавацца высокатэмпературнаму спальванню ў кіпячым слаі — гэта перашкаджае ўтварэнню шкодных рэчываў ці робіць іх утварэнне мінімальным. Прычым на такія тэхналогіі спальвання арыентаваныя новыя міні-ТЭЦ.

Працэс стварэння новых міні-ТЭЦ у Беларусі ідзе актыўна. Нашмат менш развіты (у адрозненне ад той жа Еўропы) такі напрамак, як спальванне адходаў. Хоць прымальная схема тут даволі простая: дзякуючы папярэдне разлічанай геаметрыі спальваючага ўстройства і тэмпературам ідзе разбурэнне дыяксінаў , а іх рэшткі — улоўліваюцца зноў жа спецыяльнымі прыстасаваннямі.

— Сёння ёсць шмат адметных напрацовак, — адзначае Сяргей Заўялаў. — Скажам, давялося пабачыць цікавы праект у Румыніі: там камунальныя адходы не сартуюцца, а трапляюць у плазменную ўстаноўку і ператвараюцца ў газ, які потым праходзіць тры ступені ачысткі, а ачышчаны газ спальваецца ў кангенерацыйнай установцы з атрыманнем электрычнай і цеплавой энергіі. А ў Швецыі і Германіі існуе асаблівы падыход да патэнцыяльна шкоднага попелу: ён звозіцца ў спецыяльна адведзенае месца, ляжыць там тры месяцы да заканчэння пэўных хімічных пераўтварэнняў, а затым дзеліцца на фракцыі і выкарыстоўваецца ў будаўніцтве нежылых памяшканняў.

### СТАЎКА НА СУЧАСНАЕ

Сцвярджаць, што сітуацыя з ненаўмыснымі выкідамі стойкіх арганічных забруджвальнікаў у Беларусі крытычная, ні ў якім разе нельга. На фоне іншых еўрапейскіх краін мы выглядаем зусім не кепска. І разам з тым заплюшчваць вочы на гэтую тэму — таксама немагчыма.

— Сёння мы прымаем еўрапейскія стандарты і падыходы, уводзім адпаведныя тэхнічныя дакументы, — падкрэслівае Сяргей Заўялаў. — У прыватнасці, Законам «Аб ахове атмасфернага паветра» прадугледжана, што на новыя віды паліва і адходы, што пераводзяцца ў паліва, павінны быць тэхнічныя дакументы ці вызначаныя тэхнічныя ўмовы з пазначэннем характарыстык, звязаных з утварэннем хлору. І канчатковая мэта тут зразумелая — да нас не павінны трапіць тэхналогіі, якія дапускаюць значныя ненаўмысныя выкіды стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Прычым нельга казаць, што ўкараненне такіх тэхналогій запатрабуе звышвыдаткаў. Так, у мадэрнізацыю тых жа катлоў неабходна ўкласці грошы. Але, дзякуючы энергазберажэнню, тут атрымліваецца эканамічная аддача.

**Сяргей ГРЫБ, Віктар ПАЗНЯКОЎ.**

УНП 100519825.

**ДАРЭЧЫ**

**Калі ненаўмысныя выкіды ў паветра вывучаныя дастаткова добра і на гэты конт мы маем сур'ёзную заканадаўчую базу, то, на жаль, таго ж нельга сказаць пра ваду. Таму асаблівасці назапашвання САЗ, цяжкіх металаў і іншых шкодных рэчываў вывучаюцца ў рамках сумеснага беларуска-ўкраінскага праекта па Дняпры. А плюс да таго, у гэтым плане плануецца заняцца сур'ёзным вывучэннем еўрапейскай заканадаўчай базы.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.
Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5232. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

